______________________________________________
(rajonas / miestas, mokykla)

______ klasės mokinio (-ės) ______________________________
(vardas ir pavardė)

**2012 m. pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo užduotis**

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

## TEKSTO SUVOKIMAS IR LITERATŪROS ŽINIŲ TAIKYMAS
## KALBOS ŽINIŲ TAIKYMAS

Testas

**25 мая 2012 г.** **Час – 1 гадзіна**

**ТЛУМАЧЭННІ:**

- Праверце, ці няма пустых аркушаў ці іншых дэфектаў друку ў вашым тэксце. Калі заўважыце, паведамце настаўніку.
- Пісаць можаце і алоўкам, але канчатковы варыянт павінен быць напісаны ручкай сіняга колеру. Выкарыстоўваць карэктар забаронена.
- Будзе ацэньвацца і культура вашага пісьма: невыразна напісаныя, закрэсленыя адказы не будуць ацэнены (г.зн. за гэты адказ вы атрымаеце 0 балаў).
- На пытанні адказвайце коратка і зразумела. Вашы адказы павінны змясціцца ў адведзеных радках.

**VERTINIMAS**

| Užduotys | Maksimalus taškų skaičius | Surinktų taškų suma | | |
|---|---|---|---|---|
| | | 1 vertintojas | 2 vertintojas | 3 vertintojas |
| Teksto suvokimas ir literatūros žinių taikymas | **25** | | | |
| Kalbos žinių taikymas | **15** | | | |
| Taškų suma | **40** | | | |

| TAŠKAI | |
|---|---|

Vertinimo komisija: ______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2012 

# ЗАДАННІ ПА РАЗУМЕННЮ ТЭКСТУ І ВЫКАРЫСТАННЮ ВЕДАЎ ПА ЛІТАРАТУРЫ

***(25 балаў)***

***Прачытайце верш "Слуцкія ткачыхі" і выканайце заданні 1–14.***

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна,–
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж персідскага узора
Цвяток радзімы васілька.

***Заданні 1–9 (25 балаў)***

| | Балы 1 | Балы 2 |
|---|---|---|
| **1.1.** Пра аўтара гэтага верша К. Чорны пісаў*:"Вялікі грамадзянін і патрыёт, ён усё сваё кароткае жыццё аддаў служэнню народу. Чалавек шырокай адукацыі, энцыклапедыст у самым поўным сэнсе слова, ............................ ад самых пачаткаў сваёй творчасці быў у абсягу перадавых агульначалавечых ідэй, у якіх ён знаходзіў месца беларускай нацыянальнай думцы..."*<br><br>Замест кропак напішыце прозвішча паэта, пра якога ідзе гаворка ва ўрыўку і які з'яўляецца аўтарам верша "Слуцкія ткачыхі".<br>*(1 бал)* | __ | __ |
| **1.2.** Выпішыце з урыўка (словы К. Чорнага) 3 словы, якія характарызуюць гэтага паэта.<br>..........................................................................................................................<br>..........................................................................................................................<br>*(3 балы)* | __ | __ |

*Балы*
*1 2*

**2.1.** Растлумачце значэнне слова *бяздольныя.*

.......................................................................................................................................

*(1 бал)*

**2.2.** Чаму аўтар называе гераінь верша *бяздольнымі?*

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

*(2 балы)*

**3.** Растлумачце сэнс радка *Дзявочыя забыўшы сны.*

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

*(3 балы)*

**4.1.** На якія 2 сэнсавыя часткі можна падзяліць верш? Вызначце тэму кожнай з частак.

Тэма першай часткі – ...............................................................................................

.......................................................................................................................................

Тэма другой часткі – ...............................................................................................

.......................................................................................................................................

*(2 балы)*

**4.2.** Як вы думаеце, у чым сэнс такой будовы верша?

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

*(3 балы)*

**5.** Якія дэталі беларускага краявіду паказаны ў творы? Выпішыце 3 прыклады.

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

*(3 балы)*

**6.** З той часткі верша, у якой апісваецца беларуская прырода, выпішыце 3 метафары.

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

*(3 балы)*

*Балы*
*1 2*

**7.** *Сімвал – умоўнае абазначэнне з'явы праз вобраз, які нечым нагадвае гэту з'яву (М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў).*

Сімвалам чаго ў вершы з'яўляецца васілёк?

......................................................................................................................

......................................................................................................................

*(2 балы)* __ __

**8.** Прачытайце прыведзеныя ніжэй сцверджанні і пазначце тое з іх, у якім заключаецца галоўная думка верша:

**А** аўтар заклікае ганарыцца працай слуцкіх ткачых, якія стваралі знакамітыя ва ўсім свеце вырабы;

**Б** аўтар паказвае, што прыгажосць лепш ствараць не па чужым узоры, а па сваім, родным;

**В** ідэя верша – гуманізм адносін паэта да слуцкіх ткачых, шанаванне іх працы;

**Г** галоўнае ў вершы – апяванне роднай старонкі.

*(1 бал)* __ __

**9.** Да якога віду лірыкі адносіцца гэты верш? Правільны адказ абвядзіце.

**А** Грамадзянская.

**Б** Інтымная.

**В** Пейзажная.

*(1 бал)* __ __

| Максімальная колькасць балаў – 25 балаў | | |
|---|---|---|

# ЗАДАННІ ПА ВЫКАРЫСТАННЮ ВЕДАЎ ПА МОВЕ

*(15 балаў)*

***Заданні 10.1–14 (10 балаў)***

*Балы 1 2*

**10.1.** Напішыце, які парадак слоў у сказе характэрны для верша.

.......................................................................................................................

*(1 бал)*

**10.2.** Выпішыце адзін сказ (або яго частку) для ілюстрацыі вызначанага парадку слоў.

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

*(1 бал)*

**11.** Устанавіце адпаведнасць паміж прыведзенымі ў словазлучэнні прыметнікамі і іх сэнсавай характарыстыкай. У табліцы насупраць адпаведнага тыпу прыметніка напішыце яго нумар. Пад нумарам 0 даецца ўзор.

0) ад родных ніў;

1) у панскі двор;

2) дзявочыя сны;

3) шырокія тканіны;

4) і цягам доўгія часіны;

5) у яснай далі;

6) край зубчаты.

| Тып прыметніка | Нумар словазлучэння |
|---|---|
| якасны | |
| адносны | 0 |
| прыналежны | |

*(6 балаў)*

**12.** З дапамогай двух сінонімаў растлумачце значэнне прыметніка *залатыя* з паэтычнага радка *Яны, бяздольныя, узяты ткаць залатыя паясы.*

*залатыя* (паясы) ..........................................................................................

*(2 балы)*

*Балы*
*1* *2*

**13.** Назавіце від выдзеленых членаў сказа ў прапанаваным фрагменце верша. Пасля кожнага члена сказа пастаўце выбранае тлумачэнне пад пэўнай літарай. Пад нумарам 0 даецца ўзор.

Ад родных (0) Г ніў, ад роднай *хаты* (1) .....

У панскі двор дзеля *красы* (2) .....

*Яны*, (3)..... *бяздольныя*, (4) ..... узяты

Ткаць *залатыя* (5) ..... *паясы* (6) ..... .

**А** – дзейнік;

**Б** – выказнік;

**В** – акалічнасць;

**Г** – азначэнне;

**Д** – дапаўненне.

*(3 балы)* __ __

**14.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі.

**А** ад роднай хаты;

**Б** на лад персідскі;

**В** зззяюць хвалі;

**Г** сінеюць міла;

**Д** цямнее край.

*(2 балы)* __ __

| Максімальная колькасць балаў – 15 балаў | | |
|---|---|---|

| ***Сума балаў** (40 балаў)* | | |
|---|---|---|

## Чарнавік